***Антановіч Н. М.***, *дацэнт кафедры беларускага і рускага мовазнаўства факультэта пачатковай адукацыі Беларускага дзяржаўнага педагагічнага ўніверсітэта імя Максіма Танка, кандыдат педагагічных навук, дацэнт;*
***Антонава Н. У.***, *начальнік аддзела метадычнага забеспячэння пачатковай адукацыі Нацыянальнага інстытута адукацыі, кандыдат педагагічных навук, дацэнт*

# Беларуская мова. II клас

## Установы адукацыі з беларускай мовай навучання

*Працяг. Пачатак гл. № 9–12 за 2022 г., № 1, 2 за 2023 г.*

### Урок 77*. Словы, якія абазначаюць прыметы прадметаў

***Мэта ўрока:*** фарміраваць уменне адрозніваць словы, якія абазначаюць прыметы прадметаў, правільна ставіць пытанні да іх, назіраць за іх функцыяй у мове, звярнуць увагу на граматычную сувязь са словамі, якія абазначаюць прадметы, правільна дапасоўваць прыметнікі да назоўнікаў; развіваць уменне падбіраць да тэксту загаловак, апісваць прадмет з апорай на малюнак, ажыццяўляць групоўку; фарміраваць уменне даваць характарыстыку персанажам казкі, выкарыстоўваючы словы-прыметы; развіваць звязнае вуснае маўленне, мысленне; выхоўваць знаходлівасць.

***Абсталяванне:*** сігнальныя карткі; малюнкі ці фотаздымкі смаржкоў, свежай і вялай кветак; фотаздымкі свайго населенага пункта.

**1. Арганізацыйны этап.**

**2. Этап праверкі дамашняга задання і актуалізацыі ведаў.**

***Практыкаванне 149.***

Перад праверкай дамашняга практыкавання мэтазгодна паўтарыць, на якія пытанні адказваюць словы, што абазначаюць прадметы. Трэба звярнуць увагу, што пытанні да слоў, якія абазначаюць прадметы, у сказе могуць быць іншыя (*каго? чаго? каму? чаму? кім ? чым? на кім? у чым?*). Тады трэба арыентавацца на значэнне слова.

Вучні чытаюць загадкі па адной. Называюць і тлумачаць адгадкі: неба, зоркі, месяц (неабходна звярнуць увагу, што слова *месяц* можа ўжывацца ў іншым значэнні). Далей вучні называюць словы з загадак, якія абазначаюць прадметы. Словы, якія адказваюць на пытанні ўскосных склонаў, змяняюць, каб яны адказвалі на пытанні *хто?* ці *што?*.

Вучань каля дошкі выконвае дадатковае заданне: у трэцяй загадцы знаходзіць словы, якія абазначаюць, пра што гаворыцца ў сказе і што пра гэта гаворыцца. Выпісвае і ставіць пытанні да іншых слоў у сказе. Праверку ажыццяўляюць вучні класа франтальна з дапамогай сігнальных картак.

**3. Этап вывучэння новага матэрыялу.**

***Абмеркаванне праблемнай сітуацыі.***

Настаўнік арганізуе праблемную сітуацыю наступным чынам:

— Настаўніца з іншага класа мне сказала, што ў яе вучняў не атрымліваецца скласці прыгожыя сказы. Прачытайце, што ў іх атрымалася (сказы запісаны на дошцы, дапоўнены інфармацыяй, актуальнай для населенага пункта, дзе знаходзіцца ўстанова адукацыі):

*Мы жывём у ... . У ім ёсць вуліцы. Тут стаяць дамы. Там жывуць людзі. Яны працуюць на прадпрыемствах. Дзеці ходзяць у школы і дзіцячыя садкі. Ёсць тут і бібліятэка. У ёй людзі бяруць кнігі.*

Настаўнік звяртаецца да вучняў, каб яны дапамаглі зрабіць тэкст «прыгожым». Вучні прапануюць словы. Калі трэба, настаўнік можа даць словы для даведкі (напрыклад: *буйное (прадпрыемства), чыстыя (вуліцы)* і інш.) і выкарыстаць фотаздымкі. На якія пытанні адказваюць дабаўленыя словы?

Настаўнік прапануе вучням прачытаць праблемную сітуацыю на с. 112 вучэбнага дапаможніка і паспрабаваць дапамагчы Чамучыку. Вучні тлумачаць, што Чамучык зразумеў няправільна, і ўносяць свае прапановы, як можна аздобіць маўленне. Настаўнік правакуе, што трэба было проста прыгожа напісаць сказ і размаляваць яго рознымі каляровымі алоўкамі. Вучні абмяркоўваюць гэту прапанову і абвяргаюць яе.

***Паведамленне тэмы і мэт урока.***

Настаўнік паведамляе, што словы, якія абазначаюць прыметы прадметаў, і з'яўляюцца тэмай урока

* Этап работы па фарміраванні навыкаў каліграфічнага пісьма (чыстапісанне) уключаецца ў структуру ўрока настаўнікам і праводзіцца ў сістэме. Матэрыял па чыстапісанні адбіраецца з улікам тыповых графічных памылак вучняў класа.

Вучні чытаюць праблемнае пытанне. Настаўнік засяроджвае ўвагу на тым, што пры выкананні практыкаванняў трэба вызначыць гэтыя пытанні. Гэта і будзе мэта ўрока.

***Практыкаванне 150.***

Арганізаваць выкананне заданняў практыкавання можна ў дзвюх групах ці, з улікам магчымасцей вучняў, у парах. Кожная група працуе з адной загадкай. Заданні выконваюцца ў групах паводле плана:

1. Прачытаць загадку. Адгадаць яе. Растлумачыць адгадку.
2. Знайсці і выпісаць словы, якія абазначаюць прыметы прадмета і адказваюць на пытанне *які?*.
3. Знайсці іншыя словы, якія абазначаюць прыметы прадмета. Паставіць да іх пытанні.

Пасля выканання заданняў вучні ці групы абменьваюцца атрыманымі звесткамі.

***Чытанне і абмеркаванне правіла.***

Вучні самастойна чытаюць правіла.

— Якую новую інфармацыю вы атрымалі?

**4. Этап замацавання новага матэрыялу.**

***Практыкаванне 151.***

Вучні разглядаюць малюнак і гавораць, па якіх прыметах можна адрозніць смаржкі ад іншых грыбоў. Можна зарыентаваць вучняў на ўжыванне слоў для даведкі. Далей вучні самастойна чытаюць тэкст і дапаўняюць яго патрэбнымі словамі. Для кантролю выканання задання тэкст прачытваецца выклііканымі вучнямі ўголас. Пасля гэтага адказваюць на пытанне з тэксту і падбіраюць загаловак. Пры неабходнасці настаўнік можа прапанаваць яго варыянты.

Вучні выконваюць заданні, змешчаныя пасля тэксту практыкавання. Вызначаюць і падкрэсліваюць у сказах словы, якія абазначаюць прыметы прадметаў.

***Практыкаванне 152.***

Для выканання заданняў практыкавання, скіраваных на дыферэнцыяцыю слоў, якія абазначаюць прадмет і прымету прадмета, неабходна паўтарыць, на якія пытанні адказваюць словы, што называюць прадмет. Спачатку вучні знаёмяцца са словамі з практыкавання. Прапануюць іх падзел на дзве групы: слоў-прадметаў і прымет прадметаў, ці слоў са значэннем, што падказваюць смайлікі.

Спачатку выбіраюцца словы, якія абазначаюць прадметы (*лісточкі, дзень, цень, сонца*). Да кожнага з гэтых слоў падбіраюцца словы, якія абазначаюць прыметы прадметаў (ніжэй даецца ўзор запісу на дошцы, калі гэта трэба вучням для апоры):

*Лісточкі (якія?) клейкія, сухія.*

*Дзень (які?) ясны, змрочны.*

*Цень (які?) доўгі, кароткі.*

*Сонца (якое?) ласкавае, спякотнае.*

Неабходна прапанаваць вучням дадатковае заданне для франтальнай работы. На дошцы змясціць малюнкі кветак (свежай і вялай), вучні задаюць пытанне і падбіраюць два словы, якія абазначаюць прымету прадмета ў адпаведнасці са смайлікамі:

*Кветка (якая?) свежая, вялая.*

Далей вучні выбіраюць ролю пілотаў ці касманаўтаў і выконваюць адпаведнае заданне практыкавання. Праверку выканання задання трэба арганізаваць франтальна. Словы, якія абазначаюць прыметы прадметаў, падкрэсліць хвалістай лініяй.

***Практыкаванне 153 (самастойная работа).***

Перад чытаннем тэксту вучні па малюнку ажыццяўляюць прагназаванне зместу казкі. Пасля чытання казкі тлумачаць, як рак перахітрыў лісіцу. Работа з заданнямі практыкавання арганізуецца ў прапанаванай у дапаможніку паслядоўнасці. Выбар слоў для характарыстыкі персанажаў павінен быць абгрунтаваны вучнямі.

**5. Этап паведамлення дамашняга задання.**

С. 115, практ. 154. Настаўнік чытае словы песні. З дапамогай малюнка тлумачыць, што кароў выганяюць пасвіцца вясной. Раней гэта было сапраўднае свята. Настаўнік звяртае ўвагу, што песню трэба спісаць, а словы, якія абазначаюць прыметы прадметаў, вызначыць вусна.

**6. Этап падвядзення вынікаў урока.**

— Што абазначаюць словы, якія даследавалі на ўроку? На якія пытанні яны адказваюць?

## Урок 78. Словы, якія абазначаюць прыметы прадметаў. Кантрольная работа па тэмах «Значэнне слова», «Словы, якія абазначаюць прадмет», «Словы, якія абазначаюць прыметы прадметаў»

***Мэта ўрока:*** фарміраваць уменне ставіць пытанні да слоў — назваў прымет прадметаў, знаходзіць іх у тэксце; удасканальваць уменне размяшчаць словы ў алфавітным парадку, тлумачыць правапіс слоў на вядомыя правілы, вызначаць тэму і асноўную думку тэксту; пазнаёміць са слоўнікавым словам *подзвіг*; развіваць звязнае вуснае маўленне, мысленне; выхоўваць працавітасць. Праверыць засваенне ведаў і сфарміраванасць уменняў па тэмах «Значэнне слова», «Словы, якія абазначаюць прадмет», «Словы, якія абазначаюць прыметы прадметаў».

***Абсталяванне:*** вучэбны дапаможнік «Беларусь — наша Радзіма. Падарунак Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь А. Р. Лукашэнкі першакласніку»; малюнкі каровы, вуліцы, травы, крыніцы, вады (для праверкі дамашняга задання);

карткі з заданнямі для кантрольнай работы.

**1. Арганізацыйны этап.**

**2. Этап праверкі дамашняга задання і актуалізацыі ведаў.**

***Практыкаванне 154.***

На дошцы афармлены запіс народнай песні:

Выганяю я [мал. каровы]

на __________ [мал. вуліцы],

на __________ [мал. травы],

да __________ [мал. крыніцы]

па __________ [мал. вады].

Настаўнік прапануе прыгадаць словы народнай вясновай песні і назваць словы замест малюнкаў.

— Што абазначаюць гэтыя словы?

Далей вучням прапануецца запісаць патрэбныя словы на лінейках.

— Што абазначаюць гэтыя словы? Пра якую падзею гаворыцца ў вершы. Чаму людзі яе вельмі чакалі?

Франтальна праводзіцца работа па пастаноўцы пытанняў ад слоў, якія абазначаюць прадмет, да слоў, якія абазначаюць прымету прадмета. Робіцца вывад, на якія пытанні адказваюць словы, што абазначаюць прымету прадмета.

**3. Этап выканання камбінаванай кантрольнай работы.**

Кантрольная работа выконваецца кожным вучнем самастойна ў сшытку для кантрольных работ.

Перад выкананнем кантрольнай работы настаўнік каменціруе заданні, якія павінны выканаць вучні.

Заданне 1 (адпавядае трэцяму ўзроўню вучэбнай дзейнасці).

Запішыце словы, якія абазначаюць прадмет.

*Варыянт 1:* карціна, худы, малады, кветка.

*Варыянт 2:* салодкі, цень, гарачы, слімак.

Заданне 2 (адпавядае трэцяму ўзроўню вучэбнай дзейнасці).

Запішыце. Падкрэсліце словы, якія абазначаюць прымету прадмета.

*Варыянт 1:* цёплы, вышыня, школьны, птушка.

*Варыянт 2:* каляровы, матылёк, касмічны, зорка.

Заданне 3 (адпавядае трэцяму ўзроўню вучэбнай дзейнасці).

Спішыце сказ. Падкрэсліце словы, якія абазначаюць, пра што гаворыцца ў сказе і што пра гэта гаворыцца.

*Варыянт 1:* Каля трухлявага пня вырасла сямейка жоўтых лісічак.

*Варыянт 2:* Уздоўж сцяжынкі стаяць баравікі ў карычневых капелюшах.

Заданне 4 (адпавядае чацвёртаму ўзроўню вучэбнай дзейнасці).

Злучыце словы, якія называюць прадмет, са словамі, якія абазначаюць прымету прадмета. Запішыце спалучэнні слоў.

| | | |
|---|---|---|
| *Варыянт 1:* | елка | вясёлы |
| | сонца | зялёная |
| | клоўн | ласкавае |
| *Варыянт 2:* | каса | салёнае |
| | сала | ядомы |
| | грыб | вострая |

Заданне 5 (адпавядае пятаму ўзроўню вучэбнай дзейнасці).

Прачытайце. Спішыце сказы. Дапішыце словы, якія абазначаюць прымету прадмета.

Родная мова беларусаў — ________ . ________ маўленнем чалавек карыстаецца, калі размаўляе. ________ маўленне выкарыстоўвае, калі піша. Добразычлівасць у мове праяўляецца з дапамогай ________ слоў.

**4. Этап замацавання.**

***Паведамленне тэмы і мэт урока.***

— Што абазначаюць словы, якія «ўпрыгожваюць» нашу мову? На якія пытанні яны адказваюць? Будзем вучыцца вызначаць іх у маўленні і ставіць да іх пытанні.

***Практыкаванне 155.***

Вучням прапануецца самастойна прачытаць тэкст, вызначыць яго тэму. Тэкст паўторна чытаецца вучнямі ўголас, вызначаецца асноўная думка, падбіраюцца загалоўкі. Потым тэкст чытаецца па сказах. У кожным сказе вызначаецца, пра што ў ім гаворыцца і што пра гэта гаворыцца, ставяцца пытанні да іншых слоў. Апошнім выконваецца на дошцы і ў сшытках для навучальных работ заданне, пададзенае ў практыкаванні пасля тэксту (*са* (папярэдзіць пра змену прыназоўніка) *старонкі (якой?) далёкай, у небе (якім?) ясным, песня (якая?) тоненькая*).

***Практыкаванне 156.***

***Работа са слоўнікавым словам.***

Вучні па заданні настаўніка чытаюць словы, запісаныя на дошцы ў слупок, і вызначаюць, што яны абазначаюць, на якое пытанне адказваюць.

воінскі → П_ДЗВ_Г
працоўны → П_ДЗВ_Г
спартыўны → П_ДЗВ_Г

Настаўнік прапануе дадаць у запіс наступнага слова літары галосных гукаў і здагадацца, што гэта за слова, якое яго значэнне (гераічны, самаадданы ўчынак). Калі ўзнікнуць цяжкасці, настаўнік дае заданне знайсці гэта слова на першым форзацы. Вучні зачытваюць спалучэнні слоў і прыводзяць прыклады такіх учынкаў па фотаздымках са старонак вучэбнага дапаможніка «Беларусь — наша Радзіма. Падарунак Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь А. Р. Лукашэнкі першакласніку».

Вучні чытаюць слоўнікавае слова, запісанае на дошцы, вызначаюць націскны склад і падзяляюць яго на склады. Потым вызначаюць, якім правілам падпарадкоўваецца яго напісанне (парны глухі звонкі зычны гук [х] на канцы слова, праверачнае слова *подзвігі*, пішам літару ***г***), а што трэба запомніць (два мяккія зычныя по[дз'в']іг, пасля спалучэння літар ***дз*** мяккі знак не пішам).

Работа з вершам пачынаецца з падрыхтоўкі да ўспрымання па пытаннях:

— Хто робіць адкрыцці? Хто забяспечвае іх выкарыстанне ў жыцці? Хто працуе за плугам? Хто будуе касмічныя ракеты?

— Уважліва паслухайце верш і скажыце, пра якія подзвігі марыць хлапчук.

Пасля ўспрымання верша на слых вучні адказваюць на пытанне. Перачытваюць верш спачатку самастойна, потым — уголас. Далей выконваюцца заданні практыкавання пасля верша. Праверка выканання заданняў ажыццяўляецца франтальна.

***Практыкаванне 157.***

Настаўнік прапануе разгарнуць старонку вучэбнага дапаможніка «Беларусь — наша Радзіма

Падарунак Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь А. Р. Лукашэнкі першакласніку» і разгледзець выяву самазвала.

— Якую інфармацыю «паведамляе» гэта старонка дапаможніка?

Далей вучні самастойна знаёмяцца з тэкстам практыкавання, адказваюць на пытанне перад тэкстам, задаюць па ім свае пытанні. Тлумачэнне правапісу літар на месцы пропускаў арганізуецца франтальна.

Заданне на пошук і запіс слоў, якія абазначаюць прыметы прадметаў, арганізуецца на дошцы і ў сшытках па адным сказе. Узор каменціравання: «Чытаю сказ: *Кар'ерныя беларускія самазвалы — сапраўдныя волаты*. Вызначаю слова, якое абазначае прадмет: *самазвалы*. Стаўлю пытанне: *самазвалы (якія?) кар'ерныя*. Запісваю (вучань дыктуе па складах). Стаўлю пытанне да наступнага слова: *самазвалы (якія?) беларускія*. Запісваю». Сказы, у якіх няма слоў, што абазначаюць прымету прадмета, толькі зачытваюцца.

***Практыкаванне 158.***

Настаўнік прапануе паслухаць загадку і адгадаць яе (вучні ўспрымаюць толькі на слых). Пасля адгадвання загадкі называюць словы, якія абазначаюць прыметы прадмета. Чытаюць загадку ў дапаможніку, тлумачаць літары на месцы пропускаў. Потым на выбар спісваюць ці запісваюць загадку па памяці, падкрэсліваюць словы, якія абазначаюць прыметы прадметаў. Праводзіцца ўзаемаправерка.

**5. Этап падвядзення вынікаў урока.**

Настаўнік паведамляе, што дамашняе заданне не задаецца, паколькі была кантрольная работа. Запытваецца, як вызначыць словы, што абазначаюць прымету прадмета.

### Урок 79. Аналіз кантрольнай работы. Словы, якія абазначаюць дзеянні прадметаў

***Мэта ўрока:*** фарміраваць уменне выконваць работу над памылкамі; фарміраваць уменне адрозніваць словы, якія абазначаюць дзеянні прадметаў, знаходзіць іх у тэксце, правільна ставіць да іх пытанні; развіваць уменне ажыццяўляць групоўку, уменне пісаць па памяці; удасканальваць уменне тлумачыць правапіс слоў на вядомыя правілы; пазнаёміць са слоўнікавым словам *медаль*; выхоўваць павагу да ветэранаў, герояў Вялікай Айчыннай вайны.

***Абсталяванне:*** вучэбны дапаможнік «Беларусь — наша Радзіма. Падарунак Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь А. Р. Лукашэнкі першакласніку».

**1. Арганізацыйны этап.**

**2. Этап правядзення аналізу кантрольнай работы і выканання работы над памылкамі.**

Пасля паведамлення абагуленых вынікаў кантрольнай работы вучні запісваюць у сшытках для кантрольных работ назву віду работы «Работа над памылкамі». Настаўнік тлумачыць парадак работы з дапушчанымі памылкамі на аснове спісу вывучаных правілаў на апошнім форзацы вучэбнага дапаможніка. Спачатку вучні знаходзяць у ім тыя правілы, якія адпавядаюць кожнаму заданню кантрольнай работы, чытаюць і паўтараюць сутнасць правіла. Да дошкі выклікаюцца вучні з ліку тых, хто памылак не зрабіў. Яны тлумачаць выкананне заданняў кантрольнай работы. Вучні выпісваюць у сшыткі словы, у якіх яны дапусцілі памылкі, арыентуючыся на ўзор на дошцы. Пры неабходнасці настаўнік выклікае вучняў класа, каб яны паўтарылі тлумачэнне памылкі.

**3. Этап вывучэння новага матэрыялу.**

***Абмеркаванне праблемнай сітуацыі.***

Вучні чытаюць уголас тэкст праблемнай сітуацыі і называюць, што яны рабілі. Настаўніку трэба звярнуць увагу, што адказваць можна толькі адным словам. Вучні чытаюць праблемнае пытанне і адказваюць на яго.

***Паведамленне тэмы і мэт урока.***

З дапамогай настаўніка фармулюецца тэма (словы, якія абазначаюць дзеянні прадметаў) і мэта ўрока (вучыцца іх вызначаць і ставіць да іх пытанні).

***Практыкаванне 159.***

Пасля прачытання вучнямі ўсіх слоў мэтазгодна запытацца, якой тэмай яны аб'ядноўваюцца. *(Тэмай павагі да старэйшых, ветэранаў, памяці пра іх гераічнае мінулае.)* Далей абмяркоўваецца значэнне кожнага слова. Вучні прапануюць прымету для падзелу слоў на групы. Спачатку вызначаюцца словы, якія абазначаюць прадмет, потым прыметы прадмета і дзеянні (да кожнага з іх ставіцца пытанне). Дадаткова прапануецца звязаць словы ў пары па сэнсе. Калі трэба, можна іх змяніць.

Словы, якія абазначаюць дзеянні прадметаў, запісваюцца з каменціраваннем у сшытках і на дошцы. Кожнае слова выкарыстоўваецца для складання вуснага выказвання. Напрыклад: *Ветэраны расказваюць пра смелыя ўчынкі сваіх баявых сяброў. У мірныя дні жахліва слухаць пра такія падзеі. Бацькі шукаюць звесткі пра сваіх родных, якія загінулі ў вайну. Дзеці помняць пра адважных прадзедаў. На свята Перамогі ўсёй сям'ёй людзі ідуць да помнікаў і абеліскаў. Мы памятаем аб подзвігах нашых продкаў.*

***Чытанне і абмеркаванне правіла.***

Вучні самастойна знаёмяцца з правілам і пераказваюць яго.

**4. Этап замацавання новага матэрыялу.**

***Практыкаванне 160.***

Гутарка па малюнку праводзіцца па пытаннях практыкавання. Трэба пашырыць яе змест прыгадваннем помнікаў, якія яны наведвалі. Важна на аснове пытанняў пабудаваць выказванне, у якім прасочваецца ўступная, асноўная і заключная часткі. Трэба прыгадаць, з якой нагоды могуць ускладацца кветкі, звярнуць увагу, што гэта можна рабіць у любы час. Асабліва трэба адзначыць святкаванне Дня Перамогі, якое адбываецца 9 мая.

Пажадана, каб першы раз верш прачытаў настаўнік, а вучні адказалі на пытанні, змешчаныя

перад ім у вучэбным дапаможніку. Пасля чытання верша ўголас вучні адказваюць на пытанні:

— Як павёў сябе герой верша? Чаму?

Вучні называюць дзеянні, якія ён рабіў, ставяць пытанні да гэтых слоў: (*што зраблю?*) падыду, (*што зраблю?*) пакланюся, (*што зраблю?*) пакладу, і дапаўняюць імі сказ з вучэбнага дапаможніка.

Праводзіцца работа па падрыхтоўцы да запісу верша па памяці. Вучні запісваюць верш і робяць самаправерку, падкрэсліваюць словы, якія абазначаюць дзеянні прадметаў.

***Практыкаванне 161.***

Настаўнік прапануе разгледзець малюнак і сказаць, хто будзе дзейнымі асобамі ў апавяданні, якое зараз прачытаюць вучні.

— Пра што расказвае бабуля ўнукам?

Вучні чытаюць пытанне практыкавання, на якое ім трэба адказаць пасля прачытання тэксту. Потым самастойна ці ўголас (па меркаванні настаўніка) чытаюць тэкст і адказваюць на гэтае пытанне. Вучні знаходзяць у тэксце інфармацыю пра бабулю і чытаюць яе. Па гэтай інфармацыі вучні задаюць пытанні адзін аднаму.

Вучні чытаюць тэкст па адным сказе і вызначаюць словы, якія абазначаюць дзеянне прадмета. Да гэтага слова ставіцца пытанне. Слова запісваецца з каменціраваннем ці (па меркаванні настаўніка) самастойна вучнямі ў сшытках.

***Работа са слоўнікавым словам.***

Настаўнік гаворыць, што хоча праверыць, ці ўважліва вучні чыталі тэкст.

— Што Галя папрасіла паказаць бабулю? Знайдзіце выяву ордэна на малюнку. Дзе ён знаходзіцца? Якія ўзнагароды ляжаць на стале? Прачытайце слоўнікавае слова па складах, вызначыце націскны склад. Якому правілу правапісу не падпарадкоўваецца гэта слова? Чаму? Пастаўце да слова пытанне. Што яно абазначае? Як пішацца?

Неабходна з вучнямі разгледзець гэта слова ў множным ліку. Адзначыць месца націску *медалі*.

— Разгледзьце выяву медаля. За што ім узнагароджвалі?

Вучні знаходзяць у тэксце і запісваюць сказ з гэтым словам з каменціраваннем. Вызначаюць націск ва ўсіх словах.

На першым форзацы вучні знаходзяць слова *медаль* і словы, якія з ім тэматычна звязаны. З гэтымі словамі складаецца вуснае выказванне.

***Практыкаванне 162.***

Перад чытаннем тэксту настаўнік задае праблемнае пытанне: «Ці могуць быць героямі цэлыя гарады?» Вучні выказваюць свае меркаванні. Пасля самастойнага чытання тэксту адказваюць на гэтае пытанне аргументавана. Вучні чытаюць тэкст уголас і адказваюць на пытанні перад ім, вызначаюць тэму і асноўную думку тэксту.

— Якія слоўнікавыя словы сустрэліся ў тэксце?

Далей выконваюцца заданні пасля тэксту.

У вучэбным дапаможніку «Беларусь — наша Радзіма. Падарунак Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь А. Р. Лукашэнкі першакласніку» вучні знаходзяць старонкі з інфармацыяй па тэме тэксту і абмяркоўваюць яе.

**5. Этап паведамлення дамашняга задання.**

С. 122, практ. 163. Настаўнік чытае верш. Вучні знаходзяць значэнне слова *нашчадкі* ў тлумачальным слоўніку ў канцы вучэбнага дапаможніка. Вучні чытаюць заданні практыкавання, настаўнік тлумачыць іх.

**6. Этап падвядзення вынікаў урока.**

— Якой важнай тэме быў прысвечаны наш урок? Якія словы мы вучыліся вызначаць у мове? На якія пытанні яны могуць адказваць?

## Урок 80. Словы, якія абазначаюць дзеянні прадметаў

***Мэта ўрока:*** фарміраваць уменне ставіць пытанні да слоў — назваў дзеянняў, знаходзіць іх у тэксце; развіваць уменне вызначаць лішняе слова ў групе слоў, уменне пісаць пад дыктоўку, ажыццяўляць узаемаправерку выкананага задання; узбагачаць слоўнікавы запас назвамі страў; выхоўваць цікавасць да вывучэння нацыянальных страў.

***Абсталяванне:*** сігнальныя карткі, фартух.

**1. Арганізацыйны этап.**

**2. Этап праверкі дамашняга задання і актуалізацыі ведаў.**

***Практыкаванне 163.***

Праверку дамашняга задання трэба пачаць з паведамленняў вучняў пра іх родных, якія ўдзельнічалі ў Вялікай Айчыннай вайне. Неабходна нагадаць ці запытацца ў вучняў, калі адбываецца святкаванне Дня Перамогі і асабліва ўшанаванне ветэранаў і ахвяр гэтай вайны.

Вучні выразна чытаюць верш, запісаны ў сшытках. Звяртаецца ўвага на вымаўленне (націск) слова *медалі*. Вучні тлумачаць, чаму прысвечаны верш, чаму вучыць нас.

— Як можна яшчэ ўшанаваць ветэранаў?

Вучні называюць словы, якія абазначаюць дзеянне прадмета, і пытанні да іх: (*што зрабілі?*) не забылі, (*што рабілі?*) баранілі, (*што зрабі?*) пакажы. Прыгадваецца тэма ўрока: «Словы, якія абазначаюць дзеянне прадмета». Настаўнік фармулюе мэту ўрока: вучыцца вызначаць такія словы і ставіць да іх пытанні.

**3. Этап замацавання вывучанага.**

***Практыкаванне 164.***

Вучні чытаюць і адгадваюць загадку.

— Якое яшчэ можа быць прызначэнне ў кошыка? (Можна дапоўніць загадку радкамі пра выкарыстанне кошыка для збору яблыкаў.) З кім аўтар параўнаў кошык? Чаму?

— Якія словы адрозніваюцца двума гукамі? Вымавіце словы, вызначыце гэтыя гукі і ахарактарызуйце іх. Знайдзіце ў загадцы словы на правапіс парных па звонкасці-глухасці зычных. Падбярыце вусна да іх праверачныя словы.

Пасля папярэдняй падрыхтоўкі вучні выконваюць астатнія заданні практыкавання. У запісаных сказах

трэба вызначыць словы, якія абазначаюць, пра што гаворыцца ў сказе і што пра гэта гаворыцца.

***Практыкаванне 165.***

Вучні самастойна чытаюць словы кожнага радка і вусна выконваюць заданні практыкавання перад словамі. Мэтазгодна запытацца, што абазначаюць лішнія словы кожнага радка. Падзел вучняў на групы «пілотаў» і «касманаўтаў» можа быць зроблены любым спосабам па меркаванні настаўніка. Вучні выконваюць пісьмовае заданне.

Пры праверцы выканання задання група «касманаўтаў» называе прыдуманыя словы, ставіць пытанні да гэтых слоў, а вучні групы «пілотаў» сігнальнымі карткамі ацэньваюць правільнасць.

***Практыкаванне 166.***

Вучні самастойна чытаюць тэкст і фармулююць пытанні па яго змесце. Настаўнік правярае, як уважліва чыталі вучні тэкст. Прапануе загарнуць падручнікі і пералічыць стравы з бульбы, пра якія ў ім гаворыцца. Вучні гавораць, якія яшчэ стравы з бульбы яны ведаюць ці каштавалі. Далей выконваюцца астатнія заданні практыкавання.

***Практыкаванне 167.***

Настаўнік запытваецца, хто з вучняў умее гатаваць дранікі. Падручнікі пры гэтым загорнуты.

— Якія прадукты спатрэбяцца для гэтага?

Пасля адказаў вучняў настаўнік дазваляе разгарнуць падручнікі і разгледзець малюнак на старонцы 125. Вучні правяраюць свае адказы.

Далей выконваюцца заданні практыкавання. Некалькі вучняў выступаюць у ролі повара, які расказвае пра гатаванне дранікаў. Можна выкарыстаць для гэтых вучняў фартух.

Перад запісам слоў, якія абазначаюць дзеянні прадметаў, важна ставіць пытанні да іх. Падчас запісу слоў трэба вызначаць правілы правапісу і тлумачыць іх для кожнага слова: *дабаўлю, надзяру, абяру, перамяшаю*. Вучні знаходзяць словы, у якіх колькасць гукаў і літар не супадае, сярод запісаных (надзяру, перамяшаю). Тлумачаць прычыны несупадзення.

**4. Этап паведамлення дамашняга задання.**

С. 126, практ. 168. Настаўнік з вучнямі хорам чытаюць скорагаворку. Настаўнік тлумачыць, што такое бульбяная бабка. Вучні знаходзяць слова, якое абазначае дзеянне прадмета. Настаўнік звяртае ўвагу, што над гэтым словам трэба напісаць колькасць гукаў і літар.

**5. Этап падвядзення вынікаў урока.**

— Што могуць абазначаць словы? На якія пытанні яны адказваюць?

*Працяг будзе.*

***Муравьёва Г. Л.***, *кандидат педагогических наук, доцент, заведующий кафедрой естественно-научных дисциплин Белорусского государственного педагогического университета имени Максима Танка;*
***Урбан М. А.***, *доктор педагогических наук, доцент кафедры естественно-научных дисциплин Белорусского государственного педагогического университета имени Максима Танка;*
***Гадзаова С. В.***, *старший преподаватель кафедры естественно-научных и лингвистических дисциплин и методик их преподавания Гродненского государственного университета имени Янки Купалы*

# Математика. IV класс

## Методические рекомендации

*Продолжение. Начало см. № 7–12 за 2022 г., № 1, 2 за 2023 г.*

*Форма выполнения каждого задания обозначена с помощью букв:* ***Д*** *— задание представлено на доске и выполняется фронтально;* ***П*** *— выполняется индивидуально учащимися на партах;* ***ДП*** *— выполняется на доске и на партах.*

### Урок 107. Письменное деление на двузначное число (случаи вида 212 : 53)

***Цель:***

• познакомить с письменным делением на двузначное число для случаев вида 212 : 53.

**Устные и практические упражнения.**

***Д 1.*** Предлагается вставить пропущенные числа.

7265 дм = … м … дм = … см = … мм

25 369 кг = … т … ц … кг = … ц … кг

126 749 г = … кг … г = … ц … кг … г

5 ч = … мин = … с

***Д 2.*** Требуется выполнить и проверить деление с остатком.

| | |
|---|---|
| 49 : 6 | 25 : 3 |
| 79 : 9 | 26 : 4 |
| 268 : 50 | 168 : 20 |
| 497 : 70 | 574 : 80 |